Т а б л и ц а 1 — Структура профессионального имиджа специалиста как компонента профессиональной культуры

| Функции имиджа | Компоненты профессионального имиджа | Качественные характеристики (личностные конструкты) профессиональной культуры |
|---|---|---|
| Гносеологическая | Профессиональная компетенция и профессиональное мышление | Структура знаний, умений и навыков, обеспечивающих системный подход к постановке и конструктивному решению профессиональных задач, формирование стратегии и тактики профессиональной деятельности |
| Аксиологическая | Эмоциональный интеллект, профессиональная компетентность | Ориентация на общечеловеческие ценности. Стремление к профессиональному совершенствованию, ответственность за результаты деятельности, отсутствие противоречий между личными и общественными интересами |
| Творческая | Принципы и правила исследовательско-творческой деятельности, культура речи | Креативность, активность и предприимчивость при достижении цели, стремление к профессиональному успеху |
| Коммуникативная | Профессиональная компетентность, культура речи, внешний вид | Владение коммуникативными технологиями, умение работать с людьми, широкий кругозор, разностороннее развитие личности |

– аксиологической — гармоничное сочетание и отсутствие противоречий между общечеловеческими и личностными ценностями;

– творческой — креативность в стремлении к профессиональному успеху;

– коммуникативной — владение коммуникативными технологиями, разностороннее развитие личности [3, с. 45].

Описанные функции профессионального имиджа и личностные конструкты профессиональной культуры дали нам основание систематизировать и представить структуру профессионального имиджа как компонента профессиональной культуры специалиста (табл. 1).

Представленная структура послужит одним из теоретических обоснований и предпосылок к разработке модели процесса формирования профессионального имиджа будущего учителя иностранного языка.

### Список источников


1. *Коджаспирова, Г. М.* Культура профессионального самообразования педагога : пособие / Г. М. Коджаспирова ; под. ред. Ю. М. Забродина. — М. : [б. и.], 1994. — С. 135.
2. *Сластенин, В. А.* Формирование профессиональной культуры учителя : учеб. пособие / В. А. Сластенин. — М. : Прометей, 1993. — 177 с.
3. *Сластенин, В. А.* Педагогика : учеб. пособие для студентов высш. пед. учеб. заведений / В. А. Сластенин, И. Ф. Исаев, Е. Н. Шиянов ; под ред. В. А. Сластенина. — М. : Академия, 2004. — 576 с.


Материал поступил в редакцию 22.04.2011.

***І. А. Голуб***
Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт,
г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь

## ТЭАРЭТЫЧНЫЯ АСНОВЫ ВЫХАВАННЯ ТАЛЕРАНТНАСЦІ Ў СТУДЭНТАЎ

XXI стагоддзе — стагоддзе шырокага распаўсюджання ідэй правоў і свабод чалавека. Але, нягледзячы на гэта, і сёння існуюць расісцкія, рэлігійныя і фашысцкія настроі. Гэта праблема даволі актуальная як для ўсёй сусветнай супольнасці, так і для постсавецкай прасторы, у тым ліку і для нашай полікультурнай краіны.

На сённяшні дзень выхаванне ў моладзі талерантнасці, павагі да правоў людзей усіх рас і народаў павінна стаць адной з ключавых мэт адукацыі і, у прыватнасці, педагога-выхавацеля.

Што ж такое талерантнасць? У даведачнай літаратуры падаецца наступнае азначэнне (лац. tolerantia — цярпенне) — адсутнасць або аслабленне рэагавання на які-небудзь неспрыяльны фактар у выніку зніжэння адчувальнасці да яго ўздзеяння. Сутнасць талерантнасці фарміруецца на аснове прызнання адзінства і адначасова шматвобразнасці чалавецтва, узаемазалежнасці ўсіх ад кожнага і кожнага ад усіх, павага да правоў іншага (у тым ліку і права быць іншым), а таксама ўстрыманне ад нанясення шкоды, бо шкода, што наносіцца іншаму, азначае шкоду для ўсіх і для самога сябе [5, с. 43-44].

Паняцце «талерантнасць» у розных мовах мае розныя сэнсавыя адценні. Так, у англійскай мове талерантнасць — «гатоўнасць і здольнасць без пратэсту ўспрымаць асобу або рэч»; у французскай — «павага да свабоды іншага, яго складу думак, паводзін, палітычных і рэлігійных поглядаў»; у кітайскай — уменне

«дазваляць, дапускаць, праяўляць велікадушнасць ў адносінах да іншых»; у арабскай — «прабачэнне, мяккасць, паблажлівасць, спачуванне, добрыя адносіны, цярпенне»; у персідскай — «цярпенне, цярпімасць, вынослівасць, гатоўнасць да прымірэння» [2, с. 20—22].

«Дэкларацыя прынцыпаў талерантнасці», прынятая ў 1995 г. камісіяй ААН па пытаннях адукацыі, навукі, культуры найбольш поўна перадае сутнасць дадзенага паняцця. У дакуменце пазначана: «Талерантнасць азначае павагу, прыманне і разуменне багатай шматграннасці культур нашага свету, іншых форм самавыяўлення і спосабаў праяўлення чалавечай індывідуальнасці. Талерантнасць — гэта не ўступка, паблажлівасць або поўная згода з іншымі. Талерантнасць — гэта, перш за ўсё, актыўныя адносіны, якія фарміруюцца на аснове прызнання ўніверсальных правоў і асноўных свабод чалавека. … Талерантнасць — гэта паняцце, якое азначае адмову ад дагматызму, ад абсалютызацыі ісціны, а таксама сцвярджае нормы, якія ўстаноўлены ў міжнародных прававых актах у сферы правоў чалавека. Праяўленне талерантнасці, што сугучна павазе правоў чалавека, не азначае цярпімых адносін да сацыяльнай несправядлівасці, адмовы ад сваіх перакананняў або перагляду іх, прызнае такое ж права за іншымі …. Гэта таксама азначае, што погляды аднаго чалавека не могуць быць навязаны іншым» [1, с. 7].

Шматзначнасць паняцця «талерантнасць» робіць яго даволі абстрактным і агульным, маладаступным для строгага навуковага даследавання. Вызначым адпаведныя паказчыкі, крытэрыі, якія б дазволілі больш дакладна фіксаваць дадзеную з’яву. Да ліку такога кшталту крытэрыяў талерантнасці могуць быць аднесены наступныя:

– узаемная павага, добразычлівасць і цярпімыя адносіны ўсіх членаў групы адзін да другога;
– роўныя магчымасці для ўдзелу ў жыцці калектыву;
– супрацоўніцтва і салідарнасць пры рашэнні агульных праблем;
– разуменне таго, што адбываецца ва ўнутраным свеце іншага чалавека;
– гатоўнасць да ўзаемадзеяння ў разнастайных сітуацыях для дасягнення пастаўленых мэт і пабудовы канструктыўных адносін у групе;
– сфарміраванасць сацыяльна-маральных матываў паводзін асобы ў працэсе ўзаемадзеяння з членамі калектыву.

Асноўнымі формамі праяўлення нецярпімасці з’яўляюцца:

– абразы, насмешкі, выказванне пагарды;
– ігнараванне (адмова ў гутарцы);
– негатыўныя стэрэатыпы, прадузятасць, забабоны, заснаваныя на адмоўных характарыстыках;
– эгацэнтрызм;
– пошук ворага ( перанос віны за праблемы на другіх);
– запалохванне, пагрозы;
– дыскрымінацыя па розных адзнаках;
– ксенафобія (непрыязнасць да прадстаўнікоў другіх груп і культур).

Для выхавання талерантнасці неабходны людзі, гатовыя павесці за сабой уласным прыкладам. Грамадству патрэбны ўзоры для перайманія, якія будуць стымуляваць не толькі думку, але і дзеянні і ўчынкі. Дасягненне талерантнасці можа падацца цяжкім, бо адначасова яна і неабходная (жыць на адной планеце і вырашаць агульныя праблемы), і як бы немагчымая (трэба прымаць пад увагу погляды, учынкі іншых людзей, якія не заўсёды падобныя да нашых).

Выхаванне талерантнасці робіцца адной з цэнтральных тэм сучаснай адукацыі. Як выхаваць талерантнасць? Дзе межы цярпімасці? На чым заснавана цярпімасць і якія формы яна прымае?

Неабходнай умовай вырашэння гэтых пытанняў з’уляецца педагогіка талерантнасці.

Мэтай педагогікі талерантнасці А. Ю. Кляпцова вызначае выхаванне падрастаючага пакалення на негвалтоўнай аснове па законах міралюбнасці, супрацоўніцтва, павагі правоў і свабод іншых людзей, беражлівых адносін да ўсяго жывога, вырашэння канфліктаў без выкарыстання адкрытых і закрытых форм гвалту.

Трэба адзначыць, што праблема выхавання талерантнай асобы — агульнасацыяльная праблема, якая можа быць вырашана толькі пры выкананні наступных прынцыпаў і ўмоў:

– стварэння спрыяльнага псіхалагічнага клімату як асновы фарміравання талерантнай прасторы;
– наладжвання адносін узаемавагі, даверу і ўзаемнай патрабавальнасці паміж выкладчыкам і студэнтам;
– арганізацыя адукацыі студэнтаў з мэтай павышэння ўзроўню інфарматыўнасці па праблеме талерантнасці;
– варыятыўнае выкарыстанне актыўных метадаў навучання;
– фарміраванне пачуцця ўласнай годнасці, самапавагі і павагі да людзей, незалежна ад іх сацыяльнай прыналежнасці, нацыянальнасці, культуры і рэлігіі [3, с. 104].

Фарміраванне талерантнасці прадугледжвае развіццё актыўнай жыццёвай пазіцыі. Прынцып дыялогу, які непарыўна звязаны з прынцыпам талерантнасці, павінен з’яўляцца не толькі метадам навучання, але і яго мэтай.

Сродкам фарміравання талерантнасці ва ўстановах вышэйшай адукацыі могуць і павінны стаць розныя вучэбныя дысцыпліны, у прыватнаці, дысцыпліны філалагічнага профілю. Моўная культура з’яўляецца неад’емнай часткай культуры чалавека ў цэлым. Камунікатыўныя функцыі моўнай культуры дазваляюць разглядаць сістэму навучання роднай і замежнай мовам як аснову гарманічнага працэсу развіцця асобы ў кантэксце дыялогу культур.

У працэсе навучання будучых спецыялістаў могуць і павінны выкарыстоўвацца розныя сродкі і прыёмы фарміраваўння талерантнасці:

– уключэнне ў змест адукацыі супрацьлеглых, узаемавыключальных бакоў, уласцівасцей, адносін у вывучаемых аб’ектах, працэсах, з’явах;

– зварот да такога тыпу мыслення, які арыентуецца на адзінства супрацьлеглых бакоў, што забяспечвае цэласнасць існавання вывучаемага аб’екта або працэсу;

– выкарыстанне фактаў і звестак, якія з’яўляюцца адбіткам адзначаных якасцей у канкрэтных фрагментах навуковага пазнання [4, с. 44—49].

Паспяховасць фарміравання талерантнай асобы студэнта ў многім вызначаецца талерантнай культурай выкладчыка. Выкладчыкі, якія працуюць над праблемай развіцця талерантнасці, павінны ствараць атмасферу супрацоўніцтва, дух партнёрства, гатоўнасць мірыцца з чужымі поглядамі, павагай чалавечай годнасці і правоў іншых, прыняцце іншага такім, які ён ёсць, здольнасць уявіць сябе на месцы іншага, прызнанне шматграннасці і роўнасці іншых, цярплівасць да іншых поглядаў, вераванняў і паводзін, адмова ад дамінавання, учынення шкоды і гвалту.

Такім чынам, выхаванне асобы, якая адрозніваецца цярпімасцю да розных поглядаў, непрадузятасцю да ацэнкі калег, партнёраў, падзей, здольнай тварыць свой лёс і лёс сваёй краіны, быць ў адказе за спакой сваёй малой радзімы — адна з прыярытэтных задач вышэйшай школы. Усяго гэтага можна дасягнуць толькі ўсведамляючы, што навакольны свет і сацыяльнае асяроддзе з’яўляюцца шматмернымі, а значыць і погляды на гэты свет шматгранныя і не павінны зводзіцца да аднастайнасці. Бо толькі развітая асоба, чалавек высокай культуры, які валодае духоўна каштоўнаснай матывацыяй, здольны да талерантнага мыслення і паводзін.

## Спіс крыніц


1. Декларация принципов терпимости, принятая на 28 сессии Генеральной конференции ЮНЕСКО 16 нояб. 1995 г. — Париж : ЮНЕСКО, 1995. — 16 с.
2. *Ильиченко, Л.*. Педагогика поликультурности и толерантности / Л. Ильиченко // Дошкольное воспитание. — 2004. — № 8. — С. 20—22.
3. *Клепцова, Е. Ю.* Психология и педагогика толерантности : учеб. пособие для слушателей системы доп. проф. пед. образования / Е. Ю. Клепцова. — М. : Академ. проект, 2004. — С. 104.
4. *Коржуев, А. В.* Толерантность в контексте педагогической культуры преподавателя ВУЗа / А. В. Коржуев, Н. Ю. Кудзиева, В. А. Попков // Педагогика. — 2003. — № 5. — С. 44—49.
5. *Ростиславова, О. А.* Толерантность как гуманистическая ценность / О. А. Ростиславова // Среднее профессиональное образование. — 2006. — № 4. — С. 43-44.


Материал поступил в редакцию 12.04.2011.

***О. О. Красовська***
Міжнародний економіко-гуманітарний університет
імені академіка С. Дем’янчука,
м. Рівне, Україна

# СУЧАСНІ ЗАРУБІЖНІ ТА ВІТЧИЗНЯНІ ПІДХОДИ ДО ЕСТЕТИКО-ПЕДАГОГІЧНОЇ ПІДГОТОВКИ МАЙБУТНІХ УЧИТЕЛІВ ПОЧАТКОВИХ КЛАСІВ

**Постановка проблеми.** У державних та міжнародних документах [3; 5] з проблем вищої освіти наголошується на необхідності формування нової генерації педагогічних кадрів, підготовленої до якісного забезпечення освітніх потреб особистості, розвитку її інтелектуального та культурного потенціалу. Вирішення цієї проблеми в сучасних умовах вимагає від вчителя глибокого усвідомлення особистісно зорієнтованої парадигми освіти, творчого підходу до організації навчально-виховного процесу з дисциплін естетичного циклу, мистецької грамотності, володіння сучасними педагогічними технологіями тощо.

**Формулювання цілей статті.** Метою даної статті є висвітлення сучасних вітчизняних та зарубіжних підходів педагогічної підготовки майбутніх учителів початкових класів у гуманітарному університеті до викладання мистецьких дисциплін.

**Аналіз останніх досліджень та публікацій.** Проблема підвищення професійної компетентності педагогічних кадрів розглядається у різних аспектах у працях В. Адольфа, Ш. А. Амонашвілі, І. Ареф'єва, С. Батищева, В. Бондаря, О. Владиславлєва, С. Висоцької, Ю. Пільбуха, С. Гончаренка, М. Дробнохода, Т. Добудько, С. Єжанова, В. Ізвозчикова, М. Коломійця, Н. Кузьміної, Н. Лобанової, В. Лозової, А. Маркової, В. Синенка, М. Скаткіна, М. Чошанова, О. Шияна та ін. Так, педагогічний аспект розглядали В. Бездухов, Л. Большакова, Т. Добудько; психологічний — М. Лук'янова, О. Попова, В. Семиченко, Н. Яковлєва; соціально-перцептивний — Н. Єршова; загальнокультурний — О. Котлярова; комунікативний — В. Кузовлєв.

Значення фахової компетентності майбутнього вчителя як передумови його майбутнього професіоналізму у процесі викладання мистецьких дисциплін підкреслюється в педагогічних працях Г. Фешиної, Г. Петрової, І. Зязюна, Л. Хомич, О. Рудницької, А. Комарової, В. Подрєзова.